ЭШС

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ

7

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




# Б

**Б**, другая літара беларускага алфавіта. У кірыліцкім алфавіце лічбавага значэння не мела і адлюстроўвалася на пісьме графемай **Б** «букі» («боукы»), утворанай графічным відазмяненнем візантыйскай літары **В**. У глаголіцы абазначалася графемай Ⰱ і мела лічбавае значэнне 2. Кірыліцкая літара паходзіць ад грэч. (грэка-візантыйскай) літары **β** «бэта», пазней – «віта»: для перадачы славянскага гука [б] аўтары кірыліцы графічна змянілі грэчаскую **β** і надалі ёй новую форму **Б**. У кірыліцкіх рукапісных помніках 15—17 стст. выкарыстоўвалася ў некалькіх варыянтах (у залежнасці ад тыпу пісьма — устаў, паўустаў, скорапіс), у 16 ст. набыла друкаваную форму. З'яўленне і ўжыванне малой і вялікай літары ў друкаваных кнігах звязана з выдавецкай дзейнасцю Ф. Скарыны. У сучаснай графіцы бывае вялікая і малая, мае друкаваную і рукапісную формы. У сучаснай беларускай мове абазначае шумныя звонкія выбухныя губныя зычныя [б], [б'] (*барва* [ба́рва], *бівень* [б'ів'эн']), а перад глухімі зычнымі і на канцы слоў вымаўляецца парны да [б] па звонкасці і глухасці гук [п] (*бабка* — [ба́пка], *грыб* — [грып]). Пры класіфікацыі мае значэнне «другі» (*пункт «Б»*), можа выкарыстоўвацца пры лічбавай нумарацыі для размежавання прадметаў пад адным нумарам (*клас 7 «Б»*). *В.В. Урбан.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ